читателей и, возможно, будущих писателей. Несмотря на то, что фанфики отнюдь не новая ветвь в творчестве, однако очень актуальная и близкая для нашего общества. Написания подобных произведений позволяет человеку выразить свои эмоции и чувства, найти единомышленников, забыв про одиночество и иногда убежать от проблем. Стоит также заметить, что создание фанфиков стало своеобразным хобби для подростков. Их может писать абсолютно любой человек, вне зависимости от возраста, пола, уровня образования, а большая разнообразность и способность выразить своё мнение привлекает большинство людей таких сайтов. Молодежь при написании фанфиков, допуская ошибки, становится лучше, может поднять уровень своей грамотности, достичь определенных успехов в писательском деле в будущем.

**Литература.**

2. Московкина, Е. А. Фанфикшн как феномен читательской культуры: между автором и читателем / Е. А. Московина // Мир науки, культуры, образования. – 2018. - № 5 (72). – С. 458-459.

2. Шавлюк, В. Б. «Фанфикшн»: от жаргонизма к термину / В. Б. Шавлюк // Вестник Нижегородского государственного университета им. Н. И. Лобачевского. – 2017. - № 1. – С. 245-249.

УДК 811.161.3’373.21(476.5)

## «ЖАНОЧЫ СЛЕД» У ТАПАНІМІКОНЕ ВІЦЕБШЧЫНЫ: СТРУКТУРНА-СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА АЙКОНІМАЎ, УТВОРАНЫХ АД ЖАНОЧЫХ ІМЁНАЎ

**Марчанка Д.Г.**
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

*У артыкуле разглядаецца перафэрыйная група айконімаў Віцебшчыны, паходжанне якіх звязана з жаночымі імёнамі або сацыяльнымі і сямейнымі намінацыямі жанчыны. На падставе аналізу 20 тапанімічных адзінак выяўляюцца асноўныя словаўтваральныя мадэлі і семантычныя тыпы такіх назваў. Атрыманыя дадзеныя дазваляюць акрэсліць месца і ролю «жаночых» айконімаў у рэгіянальнай тапанімічнай сістэме.* ***Ключавыя словы:*** *айконім, антрапонім, матронім, патронім.*

## «FEMININE TRACE» IN THE TOPONYMICON OF THE VITEBSK REGION: STRUCTURAL AND SEMANTIC CHARACTERISTICS OF ICONYMS FORMED FROM FEMALE NAMES

**Marchanka D.G.**
Vitebsk State Academy of Veterinary Medicine, Vitebsk, Republic of Belarus

*The article examines a peripheral group of iconyms of the Vitebsk region, the origin of which is associated with female names or social and family designations of women. Based on the analysis of 20 toponymic units, the main word-formation models and semantic types of such names are revealed. The obtained data allow us to define the place and role of «female» iconyms in the regional toponymic system.* ***Keywords:*** *icononym, anthroponym, matronym, patronymic.*

**Уводзіны.** Айчынная айканімная сістэма характарызуецца істотнай доляй назваў, матываваных *антрапонімамі.* Традыцыйна ў цэнтры ўвагі анамастаў апынаюцца айконімы, утвораныя ад мужчынскіх асабовых імёнаў, што абумоўлена іх колькаснай перавагай і гістарычнай роляй патранімії ў намінацыі паселішчаў. Разам з тым, айконімы, матываваныя жаночымі імёнамі ці звязаныя з асобай жанчыны, застаюцца перыферыйнай, але надзвычай паказальнай групай для рэканструкцыі гістарычных сацыяльных роляў, сямейных адносін і мясцовай антрапаніміі.

Навуковая навізна дадзенага даследавання заключаецца ў спробе сістэматызацыі і комплекснага апісання малаколькаснай групы «жаночых» айконімаў Віцебшчыны, якія дагэтуль не былі аб’ектам спецыяльнага вывучэння.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыяламі для даследавання паслужылі айконімы, вылучаныя з выдання «Назвы населеных пунктаў Віцебшчыны» [2] шляхам суцэльнай выбаркі. У працэсе работы выкарыстоўваліся апісальны метад, метад структурна-семантычнага аналізу, а таксама параўнальна-гістарычны падыход для верыфікацыі этымалогіі асобных назваў.

**Вынікі даследавання.** Выяўленая намі група айконімаў, сваёй матывацыяй звязаных з найменнямі жанчын, складае 20 адзінак на ўвесь рэгіён. Нягледзячы на невялікую прадстаўленасць у тапанімікone, гэтыя назвы маюць свае семантычныя і граматычныя асаблівасці. Мы вылучылі чатыры асноўныя групы, аб’яднаныя агульнасцю значэння: 1) айконімы, у аснове якіх ляжаць імёны; 2) айконімы матранімна-патранімнага паходжання; 3) айконімы, якія ўзыходзяць да назваў ступеняў сваяцтва; 4) айконімы з адметнай матывацыяй.

Самай шматлікай з’яўляецца першая семантычная група, што звязана з істотнай пашыранасцю адыменных айконімаў на тэрыторыі Беларусі. Асноўную частку тапаасноў такіх назваў традыцыйна складаюць *мужчынскія кананічныя імёны*, якіх, паводле Г. М. Мезенка, налічваецца 728 на тэрыторыі Віцебшчыны [1, с. 132]. Істотна адрозніваецца сітуацыя з «жаночай» семантыкай: айконімаў, матываваных жаночымі імёнамі, налічваецца ўсяго 11.

Самай прадуктыўнай у гэтай групе айконімаў выявілася словаўтваральная постфіксальная мадэль аснова імя + **-іна (-ына)**: Яна > *Яніна* (Верх.), Хадора > *Хадорына* (Віц.), Марыя > Маша > Машка >

*Машкіна* (Віц.), Ева > *Евіна* (Гар.), Наталля > Наталіна (Мёр.), Анэля > *Анэліна* (Тал.), Адэля > *Адэліна* (Уш.), Мар'я > *Мар'іна* (Чаш.), Марына > Марынка > *Марынкіна* (Шум.).

Таксама ў гэтай групе былі выяўлены айконім постфіксальнага ўтварэння *Сафіёўка* (Арш.) і складаны айконім з часткай **-поль,** матываваны жаночым імям Марыям – *Марыямпаль* (Гар.). Таксама падчас аналізу быў вылучаны як адметны і тоесны з вышэйназваным тапонім *Ірынполле* (Леп.), які ўзыходзіць не да жаночага імя Ірына паводле народнай этымалогіі, а да мужчынскага кананічнага імя Ірын.

Другая група айконімаў пазначае сабой не толькі з'яву тапанімнага характару, але і выяўляе ўласцівую беларусам мадэль называння замужняй жанчыны ў традыцыйнай культуры, якая была прадуктыўнай цягам стагоддзяў, але ў наш час згубіла актуальнасць. У сувязі з сямейнай матывацыяй мы будзем звяртацца да паняцця матранімна-патранімнага наймення – называння жонкі (маці) праз імя ці прозвішча мужа (бацькі). Паводле такой мадэлі ўтвораны наступныя айконімы: Лявон > Лявоніха > *Лявонішына* (Верх.); Мікіта > Мікіціха > *Мікіціха* (Шум.); Салавей > Салаўіха > *Салаўіха* (Паст.).

З сямейнымі (сваяцкімі) сувязямі звязана і наступная група айконімаў (4 адзінкі), якая семантычна ўзыходзіць на назваў ступеняў сваяцтва: бабка > *Бабцы* (Док.), *Бабча* (Леп.); мамуля > *Мамулі* (Паст.); сястра > *Сястрэнцы* (Беш.).

Асобную групу тапонімаў з адметнай матывацыяй склалі дзве адзінкі:

- айконім *Дзявічкі* (Пол.), які ўзыходзіць да тапаасновы са значэннем 'маладая, незамужняя жанчына'
- айконім *Красцьянка* (Віц.) – навастворыны ў БССР айконім з характэрнай для саветонімаў хібнай фанетычнай афарбоўкай.

**Заключэнне.** Нягледзячы на сваю пераферыйнасць, айконімы, матываваныя жаночымі намінацыямі, з'яўляюцца важнай крыніцай для вывучэння гістарычнай дэмаграфіі, дыялектнай антрапаніміі і этнаграфічных асаблівасцей Віцебскага рэгіёна.

**Літаратура.**

1. Мезенка, Г. М. Каляндарнае імя ў айканіміі Віцебшчыны / Г. М. Мезенка // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы II Международной научной конференции «Словянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах». – Гомель : УО «ГГУ им. Ф. Скорины», 224. – С. 132-136.

2. Генкін, У. М. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Віцебская вобласць / У. М. Генкін, І. Л. Капылоў, В. П. Лемцюгова. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 669 с.